# Добрая каза

Была ў старой казы маладая козачка. Такая прыгожая, што ўсе вачэй з яе не зводзілі. Птушкі ёй песні пелі, а звяры, нават сам мядзведзь, перад ёй шапкі здымалі.

Але прыйшла пара козачцы развітацца з маці. Прыгледзеў козачку малады козлік і забраў яе да сябе. Далёка ад маці стала жыць цяпер козачка. На высокіх горных скалах, дзе дрэвы за сонца чапляюцца, дзе з крыніц днём і ноччу чыстая вадзіца бруіцца, а вакол шаўкавістая трава сцелецца. Засумавала каза. І вось сабралася яна аднойчы наведаць сваю дачушку. Праз балоты непраходныя дарога ляжала, праз лясы густыя, дзе ваўкі і іншыя драпежнікі вадзіліся.

Скача каза дзень, скача другі. Здарожылася і адпачыць вырашыла. На ціхай палянцы зялёнай траўкі паскубла, у лясным азерцы вады напілася, выгледзела кучаравую рабінку, лягла пад ёй ў цянёк і моцна заснула.

Доўга спала каза. Разбудзілі яе пад самы вечар буркатлівыя грымоты. Збіралася на навальніцу. Пабаялася каза ў навальніцу адна па лесе блукаць. Пакуль шукала прытулак, дождж пайшоў. Страшна і холадна стала казе. Усякую надзею пагрэцца страціла.

Скача далей па лесе каза, аж бачыць — хатка стаіць, а ў хатцы акенца свеціцца. Абрадавалася каза, да акенца падалася паглядзець, хто там у хатцы жыве, у цяпле грэецца. Зазірнула ў акенца, а ля печы барсук мітусіцца: на кляновым лісці пірагі пячэ. Пастукала каза ў акенца.

— Барсук, барсук, адкрый хатку, пусці пагрэцца.

Паглядзеў барсук у акенца і гаворыць:

— Ведаю я такіх. Нядаўна лісу пусціў пагрэцца, дык яна ў мяне збанок малака разбіла.

Як ні прасіла каза барсука, як ні маліла, барсук так і не пусціў яе ў сваю хатку. Наеўся пірагоў і задрамаў. А каза знайшла каля рэчкі стажок сена, залезла ў яго і перачакала дажджлівую ноч.

Раніцою сціхлі грымоты, на небе сонейка засмяялася. Пакінула каза стажок і ў дарогу адправілася.

Абрадавалася маладая козачка, калі ўбачыла сваю маці жывой і здаровай.

Амаль палавіну лета гасціла каза ў дачкі. З надыходам восені пачала дамоў збірацца. Трэба было на зіму хатку догледзець, сена пад паветку скласці. Развіталася каза і ў далёкую дарогу адправілася.

Дзень скача, другі, бачыць, на яе шляху барсукова хатка стаіць. Таго самага барсука, які не пусціў ад дажджу схавацца. Наблізілася да хаткі і чуе, як нехта стогне. Глядзіць каза, аж барсук на зямлі курчыцца. Пазнаў барсук казу і гаворыць:

— Сабакі ледзь не загрызлі мяне. Дапамажы, каза, выратуй...

Просіць барсук казу, а з яго вачэй слёзы коцяцца. Дапамагла яму каза ў хатку зайсці, раны перавязала, накарміла і напаіла барсука.

— Не пакідай мяне, каза. Пабудзь яшчэ, — просіць барсук.

Згадзілася каза і стала барсука даглядаць. А калі барсук здаровым стаў, пачала каза дамоў збірацца.

— Прапаў бы я без цябе, — сказаў ёй на развітанне барсук. — Добрая ты, каза. Век тваёй дабрыні не забуду і ўсім пра яе раскажу.

*Я. Галубовіч*

**Бруіцца** — ліцца.
**Буркатлівыя** — гулкія.

**Варыянт 1**

**1.** Знайдзі ў тэксце і падкрэслі сказы, з дапамогай якіх ты зможаш даказаць, што маладая козачка была рада сустрэчы з маці казой.

**2.** З апорай на змест тэксту растлумач сэнс слова ***здарожылася***.
Здарожылася — гэта значыць...

**3.** У які час сутак каза заснула пад рабінкай? Абвядзі літару з правільным адказам.

а) вечар б) дзень в) ноч г) раніца

**4.** Якая бяда напаткала барсука? Абвядзі літары з правільнымі адказамі.

а) начная навальніца
б) сустрэча з ваўкамі
в) боль ад ран на целе
г) пачуццё голаду
д) сустрэча з сабакамі
е) стала холадна

**5.** Каза прасіла барсука пусціць яе ў хатку пагрэцца. Што ёй адказаў барсук? Абвядзі літары з правільнымі адказамі.

а) "Не пакідай мяне, каза".
б) "Ведаю я такіх".
в) "Прапаў бы я без цябе".
г) "Ліса ў мяне збанок малака разбіла".
д) "Пабудзь яшчэ".

**6.** Выпішы з тэксту два словы, якія паказваюць, што барсука не турбавала, дзе і як каза перачакае навальніцу.

**7.** Прачытай сказ.

***Просіць барсук казу, а з яго вачэй слёзы коцяцца.***

Што аўтар хацеў гэтым сказаць? Абвядзі літары з правільнымі адказамі.

а) Барсуку вельмі балелі яго раны.
б) Барсук разумеў, што быў вінаваты перад казой.
в) Барсуку патрэбна была дапамога.
г) Барсуку было шкада самога сябе.
д) Барсук баяўся, што каза адмовіць яму.

**8.** Якія вывады зрабіў барсук пасля сустрэчы з казой? Абвядзі літары з правільнымі адказамі.

а) Нікому не давярай, бо кожны можа падмануць.
б) Кожны сам паклапоціцца пра сябе.
в) Неабходна дапамагаць тым, хто трапіў у бяду.
г) Думаць неабходна не толькі пра сябе.

**9.** Разгледзь малюнак. Знайдзі і выпішы з тэксту сказ, якім ты можаш яго падпісаць.



**10.** Адзнач у тэксце межы ўрыўкаў, якія адпавядаюць наступным загалоўкам.

1. Навальніца ў лесе.   2. Дапамога барсуку.

**Варыянт 2**

**1.** Знайдзі ў тэксце і падкрэслі сказы, з дапамогай якіх ты зможаш даказаць, што каза вельмі хацела ўбачыць сваю дачку козачку.

**2.** З апорай на змест тэксту растлумач сэнс слова ***курчыцца***.
Курчыцца — значыць...

**3.** У які час сутак каза звярнулася да барсука за дапамогай? Абвядзі літару з правільным адказам.

а) дзень   б) ноч   в) вечар   г) раніца

**4.** Якая бяда напаткала казу? Абвядзі літары з правільнымі адказамі.

а) пачуццё голаду
б) начная навальніца
в) сустрэча з сабакамі
г) стала холадна
д) сустрэча з ваўкамі
е) боль ад ран на целе

**5.** Барсук звярнуўся да казы з просьбай аб дапамозе. Што ён сказаў казе? Абвядзі літары з правільнымі адказамі.

а) "Ведаю я такіх".
б) "Добрая ты, каза".
в) "Дапамажы, каза, выратуй".
г) "Пабудзь яшчэ".
д) "Ліса ў мяне збанок малака разбіла".

**6.** Выпішы з тэксту два словы, якія паказваюць, што каза вельмі хацела пераначаваць у хатцы барсука.

**7.** Прачытай сказ:
***Каза ўсякую надзею пагрэцца страціла.***

Што аўтар хацеў сказаць? Абвядзі літары з правільнымі, на тваю думку, адказамі.

а) Каза пашкадавала, што адправілася ў такую далёкую дарогу.
б) Каза вельмі доўга шукала цёплае і сухое месца для начлегу.
в) Каза стамілася, ёй трэба было проста адпачыць.
г) У казы быў дрэнны настрой.
д) Каза вельмі пакутавала ад холаду і дажджу.

**8.** Які ўрок дала каза барсуку? Абвядзі літару з правільным адказам.

а) Трэба ўмець выбачаць тых, хто быў да цябе несправядлівы.
б) Стаўся да іншых так, як яны адносяцца да цябе.
в) Дабрыня дапамагае справіцца з любой бядой.
г) Не звяртай увагі на слёзы таго, хто цябе пакрыўдзіў.

**9.** Разгледзь малюнак. Знайдзі і выпішы з тэксту сказ, якім ты можаш яго падпісаць.



**10.** Адзнач у тэксце межы ўрыўкаў, якія адпавядаюць наступным загалоўкам.

1. У госці да дачушкі.   2. Святло агенца ў начным лесе.

IMG_0047.jpg
Тип: Файл JPG